АЙЦЕЦ АРХІМАНДРЫТ

# ФАБІЯН АБРАНТОВІЧ

ДА 110-ГОДЗЬДЗЯ
З ДНЯ НАРАДЖЭНЬНЯ

**1884 - 1994**

*Унія*

vytoki.net

Айцец архімандрыт Фабіян Абрантовіч MIC нарадзіўся ў Наваградку 14 верасьня 1884 году ў пабожнай каталіцкай сямьі. Скончыў у Пецярбургу семінарыю і Духоўную акадэмію, здабыў ступень магістра тэалёгіі. Потым працягваў навуку ў Лювенскім універсытэце ў Бэльгіі, дзе стаў доктарам філязофіі.

Па вяртаньні ў Пецярбург а.Фабіян быў абраны прафэсарам каталіцкае семінарыі. Таксама ён бярэ чынны ўдзел у пашырэньні беларускага нацыянальнага руху, у тым ліку сярод студэнтаў Духоўнай акадэміі. Айцец Абрантовіч быў ініцыятарам правядзеньня ў 1917 годзе ў Менску Зьезду беларускага каталіцкага духавенства, разам з а.Лукашом Хвецкам заклаў Беларускую Хрысьціянскую Злучнасьць (пазьней - Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя) - уплывовую палітычную партыю правага кірунку. У канцы 1918 году а.Фабіяна прызначаюць рэктарам толькі што адкрытае ў Менску семінарыі. У гэты ж час ён дамогся ад біскупа Лазінскага дазволу на ўжываньне беларускае мовы ў дадатковай Літургіі. З-за варожага стаўленьня бальшавікоў да Царквы семінарыю перанесьлі ў Навагрудак, потым у Пінск. Такі ж самы шлях робіць і ейны рэктар.

У 1923 годзе ў Друі віленскі біскуп Юры Матулевіч адкрыў кляштар адноўленага ім Зграмаджэньня Айцоў Марыянаў. Гэты кляштар стаў адным з цэнтраў адраджэньня Уніі на Беларусі. У 1926 годзе пралат Фабіян Абрантовіч уступае ў навіцыят айцоў Марыянаў. Тыя, хто ведаў яго ў гэты час, сьведчаць, што а.Фабіян вызначаўся вялікай пакорай, працавітасьцю, стараннасьцю. Ён і тут не пакідаў навукі: выкладаў у гімназіі, напісаў два філязофска-тэалягічных нарысы "Бог" і "Чалавек", якія выйшлі ў бібліятэчнай сэрыі часопіса "Хрысьціянская Думка" ў Вільні, часта гаварыў казаньні. Але ўжо праз два гады Апостальскай Сталіцаю быў прызначаны Ардынарыям (кіраўніком епархіі) расейскіх грэка-каталікоў у Кітаі і дзеля гэтага прыняў бізантыйскі абрад.

Айцец Фабіян меў вялікія цяжкасьці на місіі ў Гарбіне. Шмат крыўдаў цярпеў ад кітайскіх уладаў, праваслаўных расейцаў і нават ад братоў Езуітаў, якія адмовілі грэка-каталіцкім сьвятаром у просьбе дазволіць адпраўляць набажэнствы у рыма-каталіцкіх касьцёлах. Але й у такіх цяжкіх варунках епархія разьвівалася, была збудаваная царква ў Гарбіне, закладзеная гімназія сьв.Мікалая з інтэрнатам для вучняў, дзьве школы для дзяўчатаў, дом Марыянаў, распачатае ў 1931 годзе выданьне часопісу "Католический вестник".

У 1938 годе а.Фабіян ад'ехаў з Гарбіну ў Рым для ўдзелу ў генеральнай капітуле айцоў Марыянаў. На адваротным шляху ён

vytoki.net

паехаў на Беларусь, дзе архімандрыта засьпела вайна. Бальшавікі схапілі хворага а.Фабіяна й кінулі ў Львоўскі астрог. Польскі афіцэр Язэп Бяляўскі сьведчыў, што ў сьнежні 1939 году ён сядзеў у камеры №83 разам з а.Абрантовічам, якога абвінавачвалі ў шпіянажы на карысьць Японіі, прымушалі адмовіцца ад веры. Усё гэта суправаджалася страшнымі мучэньнямі. Айцец Язэп Германовіч піша: "*На сьледзтве бальшавікі ўжывалі да айца найвышэйшы нумар сваёй інквізыцыі - аж да іголак пад пазногці і ўліваньне вады ў лёгкія, каб прызнаўся да закідаў, якія ім былі патрэбныя. Аднак а.Фабіян Абрантовіч не паддаўся - яго зламілі толькі фізычна, а пасьля зьліквідавалі як сапраўднага Мучаніка за веру й Бацькаўшчыну*"[1]. Тое ж самае паўтарае Я.Бяляўскі: "*Монс. Абрантовіч амаль увесь час быў бяз сьведамасьці дзеля гвалтоўных катаваньняў у часе сьледзтва і, калі прыходзіў да сябе з дапамогаю перадусім сп.Хайеса (заступнік старшыні Львова, арыштаваны), дык блізу ўвесь час праводзіў у малітве, у чым усе іншыя вязьні нашага адзьдзяленьня яго насьледвалі... Монс. Абрантовіч не прымаў амаль ніякае пажывы. Яму не дазвалялі спаць або адпачываць днём, а начамі ад гадз. 9 вечара да 5 раніцы цягалі на дапросы. Ён штодня прыходзіў - лепш сказаць - яго ўносілі і кідалі як мяшок - зьбіты гумовымі палкамі. Ён увесь час быў здэфармаваны, але пазнаць яго было лёгка, хаця за вопратку меў парванае лахмоцьце і яго прыгожая барада ўся была ў крыві*"[2].

На жаль, нам сёньня невядома, калі й дзе дакладна памёр ці быў забіты а.Фабіян. Айцец Ян Капуста, ігумен дому Салезыянаў у Лодзі, сьведчыў, што ў верасьні 1943 году ён сядзеў разам з архімандрытам на Лубянцы ў Маскве. У 1949 годзе а.Абрантовіча ўжо не было ў жывых.

**Просім Вас маліцца, каб добры й спагадлівы Бог праславіў вернага слугу Свайго а.Фабіяна Абрантовіча, які мужна прыняў вянок Мучаніка, стаў сапраўдным вызнаўцам веры.**

---

*1.* а.Язэп Германовіч. Кітай-Сібір-Масква. - Мюнхен, 1962. - С.147.

*2.* а.Часлаў Сіповіч. Айцец Архімандрыт Фабіян Абрантовіч // Божым шляхам. - Парыж, 1957. - №78-81.

*3.* Męczennicy z Rosicy. - Warszawa, 1993. - S.48.

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
sprava
vytoki.net

Айцец Георгі Бранчанінаў:

*"Сапраўды, ужо даўно быў перакананы, што <...> айцы Андрэй Цікота, Фабіян Абрантовіч і Ўладыслаў Мажонас зьяўляюцца сапраўднымі мучанікамі, годнымі праслаўленьня. У ранішніх і вячэрніх малітвах прашу іх, каб дапамагалі мне ў штодзённых клопатах, і ўпэўнены, што іхныя малітвы мілыя Богу"*[3].

Калі Вы больш дакладна ведаеце аб лёсе а.Фабіяна Абрантовіча, напішыце, калі ласка, у рэдакцыю часопіса "Унія":

Belarus' 220050, Менск, п/с 224

**Менск, 1994**

vytoki.net